★ ★ ★

**Алег ЛОЙКА**

*Пражытае — не памяці рубцы*
*І не ўспамінаў вохкая трывога,*
*Яно — са мной, навечна,*
*як байцы,*
*Што неслі ў сорак пяты*
*перамогу;*

*Яны мяне хавацца гналі ў склеп,*
*Каб не забіла куля-шаляніца,*
*Біклагі напаўняючы з крыніцы,*
*Нам пакідалі свой салдацкі*
*хлеб;*

*Ён порахам усіх франтоў*
*прапах...*
*Акраец беручы, штодня і сёння,*
*Здаецца мне, бяру яго*
*з далоняў,*
*Што развінаў перамогі сцяг;*

*Няхай сваім крылом ён ахіне*
*І будучыню!..*
*Слава вам, салдаты,*
*Што Перамогі дзень узнеслі*
*датай*
*Другога дня радзін ці ж*
*толькі мне?!*

*Як галубы, над намі самалёты,*
*Блакіт у аярынах аж дыміць,*
*Спяшыць сцягі зялёныя лістоты*
*Вясна з тугіх пупышак*
*расчахліць, —*

*І гэтак будзе — будзе з году*
*ў год,*
*Нібы байцы, каторых не забуду,*
*Пакуль у памяці нашчадкаў*
*буду,*
*Пакуль жыць будзе чалавечы*
*род!*

*І гэтак будзе, бо сюдой прайшлі,*
*Трымаючы ля сэрцаў аўтаматы,*
*Байцы, што пакідалі хлеб*
*па хатах,*
*Мір несучы навечна ўсёй зямлі!..*




**Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!**

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 14—15 (603) | Пятніца, 7 мая 1965 г. | Год выдання XVIII | Цана 2 кап.





## ПОЛЫМЯ ЎСЕНАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ

**22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія раптоўна напала на нашу Радзіму. Узброеныя да зубоў гітлераўскія орды ўварваліся ў межы савецкай зямлі, каб здзейсніць свае планы сусветнага панавання, сцерці з твару зямлі першую ў свеце сацыялістычную краіну і заняволіць свабодалюбівы савецкі народ.**

**Савецкая Беларусь адна з першых прыняла на сябе ўдар гітлераўскіх захопнікаў. Заняўшы Беларусь, гітлераўцы ўстанавілі ў гарадах і сёлах жорсткі тэрор, пакрылі яе тэрыторыю віселіцамі, густой сеткай лагераў смерці. На заводах і фабрыках фашысты ўстанавілі прыгонніцкі лад. Жорсткай распраўай над насельніцтвам яны хацелі запалохаць савецкіх людзей, зламаць іх волю да барацьбы і волю да перамогі.**

**Па закліку роднай Камуністычнай партыі беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, падняўся на ўсенародную барацьбу з ненавісным ворагам. На часова акупіраванай тэрыторыі рэспублікі разгарнулася барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Партызанскія атрады пачалі біць фашысцкую нечысць з тыла і хутка ператварыліся для іх у грозную сілу. Усенародная партызанская барацьба на Беларусі кіравалі партыйныя арганізацыі. У тыле ворага дзейнічала 9 падпольных абкомаў, 174 раённых і гарадскіх камітэтаў партыі. Партыйныя арганізацыі налічвалі ў сваіх радах 25 тысяч камуністаў.**

**Беларускі народ беражэ ў сваіх сэрцах памяць аб верных сынах і дочках Радзімы, загінуўшых у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Занятыя мірнай працай, савецкія людзі змагаюцца за мір. У нашы дні ідэя мірнага суіснавання краін з розным грамадскім ладам знаходзіць гарачую падтрымку ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.**

**За дваццаць год пасля Вялікай Перамогі нашым народам пройдзен слаўны шлях пабудовы камунізма. Уперадзе — новыя працоўныя перамогі. І як клятву вернасці справе партыі мы абвяшчаем:**

**— Слава савецкаму народу—будаўніку камунізма, мужнаму барацьбіту за мір і шчасце ўсіх людзей на зямлі!**



